Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(63), 2010

*УДК 12:2–558.2:392.17*

# Пачатак, канец і лёс: мова і пісьмо ініцыяцыі

А. Д. Паўлавец

Пачатак. Усё на што не кінь вокам мае пачатак, нават наш артыкул. Усё так ці інакш распачынаецца. Калі мы глядзім навокал, то надзяляем ім усё наяўнае праз рацыянальныя аперацыі: мы знаходзім кропку адліку, нярэдка, адвольную, і пачынаем ад яе, робім пачаткам. Аднак, калі мы глядзім на сябе, на сваё жыццё, то разумеем, што аўтабіяграфія, якую мы напішам пра сябе, ніколі не будзе мець пачатку.

Чалавек, звычайна, звязваецца з двума пачаткамі. Першы пачатак – гэта Усеагульны Пачатак, Пачатак сусвету, які апынаецца тым пачаткам, што нам не падпарадкоўваецца, у лепшым выпадку, мы здольныя толькі паказаць на яго, як гэта рабілі старажытныя грэкі. Дадзены Пачатак можа быць простай субстанцыяй альбо Богам, які ўпарадкоўвае субстанцыю згодна з уласнымі ведамі. Мы звязаны з гэтым Пачаткам, паколькі мы частка Космасу і непазбежна выйшлі, як і ён, з гэтага Пачатку. Свет пачаў свой рух аднойчы і аднойчы ж спыніць свае існаванне, каб нанова аднавіцца. Другі пачатак, менавіта наш, ён у нас адзіны. Пачатак у вантробе маці, калі сустракаюцца сперматазоід і яйцаклетка (хаця тут вядуцца спрэчкі). Але ці так гэта?

Дакладна мы можам казаць пра пачатак фізіялагічны, ён адзіны ў нас так, як і фізіялагічнае заканчэнне. Аднак што рабіць з намі ў культуры? Фізіялогія і культура – дзве адрозныя рэчы. Культура дае нам разнастайныя пачаткі. Мы пачынаемся шматразова. Культурныя каштоўнасці пастаянна на нас уздзейнічаюць, мяняюць нас. І мы шматразова знікаем, але не дашчэнту, нават пасля смерці мы застаемся ў культуры. Мы, нібыта пясчаная кніга Борхеса, не маем пачатку і заканчэння. Калі ж дадаць трэцяе вымярэнне, сакральнае, то справа яшчэ больш ускладніцца.

Пытанні пра пачатак адразу ж цягнуць за сабой новы шэраг пытанняў, якія датычацца лёсу. Пачатак і заканчэнне адразу ж цягнуць за сабой лёс. Але пачатак, пачынанне хаваецца за лёсам. Апошні маскуе і сцірае пачатак. Каб разабрацца і скінуць маскі, мы вымушаны задацца яшчэ шэргам пытанняў. Калі нас мяняе культура, калі нанова ставіць у пачатку або падводзіць да чарговага заканчэння, што адбываецца з лёсам? Ён мяняецца або, наадварот, застаецца старым? Змены культурай закладзены ў нашым лёсе ці гэта нейкія стыхійныя рэчы, якія дзейнічаюць насуперак вызначанаму нам шляху?

Для вырашэння дадзенай праблемы патрэбна такая культурная з’ява, якая б утрымлівала ў сабе адначасова і нараджэнне, і пачатак (initium). Яна мусіць азначаць і шлях, па якім ідуць, і шлях, на які выступаюць (ineo). Адначасова гэта было б увядзеннем у таямніцу (initio). Усе вышэйзгаданыя словы знітаваныя з тэрмінам ініцыяцыя (initiatio). Для таго, каб падступіцца да яе, патрэбна спачатку паспрабаваць разабрацца, што ж гэта такое. З ёй звязана шмат розных уяўленняў, якія мяняюцца ад аўтара да аўтара. Некаторыя называюць ініцыяцыяй толькі абрады пераходу з аднаго ўзроставага стану ў другі. Нехта, звычайна прадстаўнікі культурнай антрапалогіі, звязваюць гэты тэрмін з плямёнамі, якія захавалі ў той ці іншай ступені першабытны лад жыцця. Некаторыя дадаюць да папярэдніх абрады сусветных рэлігій. І толькі адзінкі лічаць, што ініцыяцыя была і ёсць найбольш развітай формай у арганізацыях, якія мы называем то таемнымі, то акультнымі, то містычнымі (спіс гэтых словаў даволі вялікі, калі не казаць пра значэнне, якое ўкладваюць у іх). Аднак мы і не ставім сабе на мэце даваць канкрэтнае вызначэнне ініцыяцыі, таму што гэта пагражае трывіяльным звядзеннем да ўзроўню простай дэфініцыі. Дзеля большай аб’ектыўнасці паспрабуем разгледзець вызначэнні аўтараў, якія выйшлі з аднаго і таго ж лагера – лагера традыцыяналістаў, аднак погляды якіх даволі моцна розняцца.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Так, адзін з пачынальнікаў гэтага накірунку, Мірча Эліядэ вызначае ініцыяцыю як “совокупность обрядов и устных наставлений, цель которых – радикальное изменение религиозного и социального статуса посвящаемого. В терминах философских посвящение равнозначно онтологическому изменению экзистенциального состояния. К концу испытаний неофит обретает совершенно другое существование, чем до посвящения: становиться другим” [3, с. 12–13].

Цікавым тут уяўляецца суаднясенне “онтологического изменения экзистенциального состояния” і “изменение религиозного и социального статуса посвящаемого”. Як бачна, экзістэнцыйны стан для М. Эліядэ – тое ж самае, што і сацыяльны, і рэлігійны статус неафіта. Іншага існавання індывід не мае. Таму не дзіва, што ён вымушаны выкарыстоўваць складаныя абрады, відавочна, дзеля таго, каб хоць неяк стаць іншым. Да ўсяго, ініцыяцыя тут носіць сацыялізуючы характар.

Прадстаўнік расійскага традыцыяналізму Аляксандр Дугін, грунтуючыся на працах Юліуса Эволы, разумее пад ініцыяцыяй “опыт переживания метафизических реальностей в личном плане. В таком случае человек пытается подстроить собственное существование, свой собственный опыт под те нормы, которые вытекают из метафизической теории. <…> Процесс инициации <…> начинается <…> с попытки человеческого существа, отталкиваясь от факта собственного присутствия в определенном пространственно-временном континууме, двигаться в сторону метафизики. Инициация – это течение в «обратном направлении»” [2, с. 405-406].

Зыходзячы з дадзенага вызначэння, метафізіка для А. Дугіна – гэта тое, што засталося ў нас ззаду, тое, што мы пакінулі на сваім жыццёвым шляху і да чаго зараз маем намер павярнуцца. Яго вызначэнне карэнным чынам адрозніваецца ад вызначэння М. Эліядэ. Калі першы паказвае, што ініцыяцыя – гэта рух наперад праз нейкія карэнныя анталагічныя змены, то для А. Дугіна – гэта рух назад, які адбываецца праз імкненне да страчанага.

Выклікае вялікую зацікаўленасць вызначэнне ініцыяцыі, дадзенае заснавальнікам традыцыяналізму Рэнэ Генонам, калі “индивидууму принадлежит инициатива «реализации», которая происходит методично, под строгим и непрерывным контролем, с тем, чтобы естественно завершиться выходом за пределы возможностей самого индивида как такового”[1, с. 365]. Для Р. Генона, як бачым, ініцыяцыя азначае паступовы выхад індывід за свае межы, паступовае зжыванне сябе самога дзеля таго, каб апынуцца па-за межамі самога сябе. Прычым, яна (ініцыяцыя) носіць упарадкаваны характар як з боку індывіда, так і з боку таго, хто яго кантралюе – настаўніка.

Усё пачынаецца з радыкальнага недахопу: чалавеку нечага нестае. Ён пачынае разумець, што гэтакі стан, якім ён валодае зараз, яго не задавальняе. У чым заключана гэтая нястача (ці то ў экзістэнцыйным статусе, ці то ў індывідуальным быцці, ці то ў магчымасцях індывідуума), не так ужо і важна. Ты пачынаеш падазраваць, што ёсць нешта большае, і ты здольны гэтым валодаць, гэта “подозрение, которое есть у многих людей, на самом деле, первый признак” [2, с. 408] недахопу. Адкуль з’яўляецца гэтая нястача? Справа ў тым, што з пункту гледжання традыцыяналізму, індывід у сваёй праяве, ў прафанным свеце (у якім жывем мы з вамі) уяўляе сабой нешта хаатычнае, ён знаходзіцца ў цёмным стане. У яго павінна ўзнікнуць жаданне ўпарадкаваць сябе, праявіць, рэалізаваць тое, што прысутнічае ў ім у выглядзе чыстай патэнцыяльнасці.

Так, чалавек набліжаецца да вопыту разрыву, рыхтуючы сябе (альбо яго рыхтуюць) да разрыву са старым існаваннем, дзеля таго, каб набыць форму новага. Само апісанне з’явы разрыву выглядае даволі складанай і праблематычнай [пра гэта гл. падрабязней 2, с. 411-412]. Такім чынам, прастора у якой пачынае жыць ініцыяваны чалавек, распадаецца на шэраг разрываў, кожны з якіх прыводзіць да пераходу на больш высокую ступень існавання. У выніку ініцыяцыі адбываюцца наступныя змены:

1 заканчваецца хаатычнае існаванне ў прафанным свеце і жыццё індывіда пераходзіць да “ развития возможностей человеческого состояния, взятого в его целокупности <…> т. е. к тому, что традиционно обозначалось как восстановление «изначального состояния» [1, с. 574]” (Малыя Містэрыі). Альбо да шляху “реализации сверхчеловеческих состо-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яний <…> состояния не обусловленного<…>обозначенного как «окончательное Освобождение» или «Высшее Отождествление» [1, с. 574]" (Вялікія Містэрыі);

2 чалавек пачынае існаваць у сістэме строгай іерархіі, сярод эліты. Р. Генон звязвае малыя містэрыі з ініцыяцыяй царскаю, а вялікія з ініцыяцыяй святароў [1, с. 579];

3 індывід атаесамляецца з ведамі трансцэндэнтнымі ў адносінах да яго;

4 яго інтэгруюць у Традыцыю.

У гэтай сістэмы ёсць адзін бок, які практычна ніхто не закранаў, і мы мусім разглядзець яго больш дэталёва. Як было адзначана вышэй, пачатак і канец наўпрост звязаныя з лёсам. І тут няма нічога дзіўнага. Індывід да ініцыяцыі валодае лёсам, а гэта азначае, што ён знаходзіцца ўсёж такі ў некаторай упарадкаванай рэчаіснасці. Пакінуўшы па-за межамі сваёй ўвагі гэтую акалічнасць, пра яе забывалі ўспомніць і пасля. Што ж адбываецца з лёсам чалавека пасля ініцыяцыі? Пытанне цікавае хаця б тым, што пры адказе на яго можна было б паспрабаваць вызначыць, змены якога кшталту адбываюцца з чалавекам.

На першы погляд, заява традыцыяналістаў пра тое, што індывід, які пражывае ў прафанным свеце, суадносіцца з хаатычнай структурай, мае пад сабою даволі сур'ёзную глебу. Аднак ужо Р. Генон сам жа і адкідвае гэтую версію, пры пераліку ўмоваў ініцыяцыі ён называе першай "«потенциальность» <…>: врожденные качества (qualification), обусловленные возможностями, свойственными самой природе индивида и представляющими собой materia prima, над которой и должна производиться инициатическая работа [1, с. 378]". Нават ва ўзроставай ініцыяцыі, каб набыць спецыфічныя веды, патрэбна быць народжаным ці то хлопчыкам, ці то дзяўчынкай. Некаторыя людзі не здольныя атрымаць ініцыяцыю, паколькі не валодаюць неабходнымі якасцямі (у асноўным гэта нейкія фізічныя недахопы). Такое абумоўленне можна назваць элементам лёсу чалавека (нават больш, року чалавека), аднак наяўнасць нейкіх прыкмет не азначае, што ты за ўсё сваё жыццё здолееш рэалізаваць магчымасці, якія закладзены ў табе і абазначаны словам "патэнцыяльны".

Пасля ініцыяцыі чалавек пачынае змяняцца. Прычым радыкальныя змены адбываюцца на ўсіх узроўнях. З'яўляецца "дифференцированный человек, т. е. человек, отделенный от остальных, отстраненный от других людей [2, с. 422]. " Чалавек набывае "трансформированное тело", якое апісваецца як "телесная возможность, освобожденная от ограничительных условий [1, с. 591]. " Спіс зменаў, якія прапануюць традыцыяналісты, даволі вялікі, і пералічваць іх усе не мае тут ніякага сэнсу. Дастаткова будзе адзначыць, што новы пачатак азначае для нас якасна новае існаванне на ўсіх узроўнях: культурным, сацыяльным, фізічным. Такія нязмены не могуць не адбіцца на лёсе чалавека, паколькі ён з кожным этапам ініцыяцыі набліжаецца да той кропкі, якую можна назваць крыніцай чалавечага лёсу. Па-другое, адбываецца паступовае зжыванне індывідуальнасці, пасля кожнага разрыву мы набываем якасці, якія аддаляюць нас ад уласнага "я" і набліжаюць да стану нейкай татальнасці, што азначае паступовае вызваленне і ад індывідуальнага, і ад калектыўнага лёсу. Табе застаецца адно – ісці па шляху. Пакінуць яго немагчыма. "Инициация <…> сообщается всем раз и навсегда, обладая поистине неуничтожимым характером [1, с. 419-420]".

Увогуле ініцыяцыя нагадвае своеасаблівую мову, слоўнікавы запас якой утрымлівае ў сабе тэрміны, неабходныя для таго, каб змяняць чалавека, а пунктуацыяй выступае паступовая рэалізацыя і засваенне гэтай тэрміналогіі чалавекам. Калі браць уяўленні традыцыяналістаў пра ініцыяцыю, у адрозненне ад прафаннага ўзроўню, яна будзе падзелена на этапы і з гэтай прычыны будзе мець асэнсаваную структуру, нібыта асаблівым чынам пабудаваная мова. Адначасова кожны разрыў, кожны новы этап перапісвае чалавека, прычым перапісвае яго ўсё больш і больш абстрактнымі сімваламі, у рэшце рэшт зводзячы яго да ўзроўню аднаго слова – "аватара". У такім перазапісе "формы <…> существуют лишь как выражения единой Истины [1, с. 392]. " Такім чынам, любы запіс, любое слова адсылае да гэтага схаванага ад нас праследу, які ініцыіруемы вымушаны пераследваць, ад этапу да этапу, блукаць паміж пастаянных адсылак, каб у рэшце рэшт авалодаць недасягальнай крыніцай самога сябе і, скарыстаўшыся гэтым ключом, перапісаць сябе нанова, адначасова авалодаўшы сакрэтам і таямніцай сусветнага пісьма, таго пісьма, з якога ўсё пачало быць. Гэта выражаецца ў цікавай формуле страты/набыцця імя. "У такого существа действительно уже нет имени <…>, оно смо-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жет, если потребуется, взять любое имя для самопроявления в индивидуальной области, но имя это никоим образом не затрагивает его [1, с. 516]. ”

Лёс у такой сітуацыіі, апынаецца паміж моваю і пісьмом. Паміж вусным пераказам і пісьмовым запісам. Са сталай структуры, якая гарантавала нам адносную стабільнасць (а так звычайна ўяўляюць лёс у прафанным свеце), ён аказваецца даволі няўстойлівым утварэннем пры ўздыме на больш высокія ўзроўні быцця.

Калі мы звернемся да мовы ініцыяцыі, то апынаемся ў так званай сферы “традиционной трансмиссии”. Р. Генон сцвярджае нават ідэнтычнасць абедзвюх з’яў: “инициация – это в сущности трансмиссия <…> с одной стороны, трансмиссия духовного влияния, а с другой – как трансмиссия традиционного учения [1, с. 528]. ” Трансмісія абазначае перадачу. Мова ініцыяцыі – гэта вусная перадача. Генон кажа пра “гарызантальную” трансмісію. Такім чынам, лёс як частка гэтай мовы уяўляе сабою калектыўную з’яву, з’яву цалкам гістарычную, што абумоўлена прыналежнасцю да роду чалавечага. Аднак пры вуснай перадачы сэнс мовы вельмі хутка страціўся б, быў бы зменены. І тут з’яўляецца самая цікавая частка мовы ініцыяцыі, якая па сутнасці і забяспечвае веру, дае надзею чалавеку вырвацца з прафаннага свету. Сэнс мовы ініцыяцыі спускаецца з “надчалавечых” крыніцаў. Таму сэнс такой мовы нельга страціць, ён па-за часам. Кожны раз, калі чалавек перадае/прымае яе, з’яўляецца і сэнс нанова тут і зараз поўнасцю. Лёс, які апынаецца ў такім кантэксце, уяўляе з сябе цалкам самасную з’яву, паколькі ён атрымліваецца наўпрост з Першаснай Крыніцы. Па сутнасці, мова ініцыяцыі – гэта мова, якая дазваляе чалавеку вызваліцца ад рамак калектыўнага лёсу і скіраваць свой погляд да кантакту з самасным лёсам, каб у далейшым знітавацца з крыніцай традыцыі.

Што ж датычыцца пісьма ініцыяцыіі, то яно ператварае лёс у шматузроўневую структуру. Для перапісвання самога сябе чалавек мае шмат інструментаў, але галоўны з іх – сімвал, які выступае намёкам на “вышэйшую рэчаіснасць. ” З гэтага часу індывід фармальна ініцыяваны, ён атрымлівае “віртуальную ініцыяцыю”. Пачынаецца праца па перапісванні сябе, па пошуку тлумачэння сімвала, які “есть не столько выражение четко определенной отдельной идеи <…>, сколько синтетическая и схематическая репрезентация всей совокупности идей и концепций [1, с. 533]. ” Сімвал робіцца той кропкай адліку на кожным узроўні, які набліжае шукальніка да крыніцы яго самаснага лёсу, у якой адбудзецца канчатковае расчыненне апошняга. Рэчаіснасці, праз якія праходзіць індывід, таксама сімвалы, яны адсылаюць адна да адной, таму што “истинное основание символики – это соответствие между всеми уровнями реальности, связывающее их друг с другом и простирающееся, стало быть, от естественного до сверхъестественного [1, с. 466]. ”

Што ж адбываецца з лёсам, калі пачатак і канец супадаюць. У сітуацыі пераходу асобы з аднаго якаснага стану ў другі лёс адыгрывае ролю стабілізітара, які гарантуе нам як сувязь з грамадствам, так і сувязь са сваёй індывідуальнасцю. Немагчымы гарантаваны разрыў паміж індывідам і лёсам, магчымы пераход з адной культурнай сітуацыі ў другую. Гэта дазваляе зрабіць адну цікавую заўвагу пра ролю лёсу ў станаўленні нашай індывідуальнасці. Калі калектыўны лёс дазваляе нам быць гістарычнай, культурнай, сацыяльнай асобай, якая мае сваё месца ў іерархічнай сістэме грамадства, то індывідуальны лёс выступае як ядро нашай асобы, што не дазваляе нам раскрыцца ў праявах сацыяльнага. Самасны лёс – гэта тое, што дазваляе адрозніваць сябе ад іншых.

**Рэзюмэ.** У артыкуле разглядаюцца пытанні суаднесенасці лёсу і пачатку, якая найлепшым чынам праяўляе сябе ў ініцыяцыі, што мае сваю мову і сваё ўласнае пісьмо. На матэрыялах філасофіі традыцыяналізму праводзіцца аналіз стану індывідыума, яго лёсу ў працэсе праходжання ініцыяцыі.

**Abstract.** The life and beginning interrelation that best of all reveals itself in the initialization that has its own language and writing is considered in the article. A person’s position, his fate during the initialization are analyzed according to traditionalized philosophy concepts.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Літаратура**

1 Генон, Р. Заметки об инициации / Р. Генон // Символика креста / Р. Генон. – М.: Прогресс-Традиция, 2004. – С. 357-660.

2 Дугин, А. Философия традиционалима / А. Дугин. – М.: Арктогея-Центр, 2002. – 624 с.

3 Элиаде, Мирча. Тайные общества. Обряды инициации и посвящения / Мирча Элиаде. – М.: СПб.: Университетская книга, 1999. – 356 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 21.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ